View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE



*І.Д.Воюш*

*Інтэрпрэтацыя жаночай суб'ектыўнасці*
*ў творах пра Ефрасінню Полацкую*

Беларусь нарадзілася з жаночым абліччам. Нашаму народу пашчасціла самыя пачатковыя крокі сваёй гісторыі прайсці па слядах першай святой жанчыны Полаччыны – святой Ефрасінні Полацкай. Цёзка княгіні Прадславы, бабкі славутай Рагнеды, удавы Уладзіміра Чырвонае Сонейка, якую палачане пасадзілі на прастол, унучка Усяслава Чарадзея, яна з годнасцю ішла слядамі сваіх любімых гераінь – святых Фяўроніі і Еўпраксіі, слядамі вялікай князёўны Ганны, празванай Янкай, якая пасля паломніцтва ў Царград прыняла пострыг і "адкрыла вучэльню для дзяўчынак і сама навучала іх грамаце, спевам, шыццю" пры царкве св. Андрэя ў Кіеве. Побач са славутай палачанкай няходжанымі сцежкамі гісторыі лампаду духоўнасці неслі новагародскі цудатворца Антоній-Рымлянін, першы ігумен Смаленскага Багародзіцкага манастыра Аўраам Смаленскі, які "бысть книжник великий», першы ігумен Міроժскага Спаскага манастыра Аўраам Пскоўскі, епіскап Ноўгарадскі Усевалад-Гаўрыіл, святы Кірыла Тураўскі, найпадобнейшы летапісец Кіева-Пячэрскага манастыра Нестар – тыя, чые светлыя лікі праменяць з глыбінь стагоддзяў.

Паспрабуем прасачыць, веха за вехаю, шлях святой Ефрасінні.

1101(1104)—1113(1114)г.г.

Нарадзілася і правяла дзяцінства Прадслава ў сям'і князя Святаслава-Георгія, брата тагачаснага полацкага князя, і княгіні Сафіі на Полацкім дзядзінцы. Сярод яшчэ жывых язычніцкіх прымхаў і перадавых еўрапейскіх кніг, у тым ліку і славянскіх, узрастала і сталела душой юная князёўна. Па словах У.Арлова, сярод жанчын "Усяславава ўнучка ў той эпосе не мела роўных сабе і ў славянскім свеце, і на ўсім еўрапейскім кантыненце" не толькі па ўзроўні адукаванасці, але і па палымяным імкненні служыць сваайму народу.

Год, калі Прадславе споўнілася дванаццаць, бадай, самы загадкавы ў яе біяграфіі. Тады, пасля працяглай гутаркі з удавой князя Рамана Усяславіча, ігуменняй манастыра, маладая, "бяше бо льпа лицем», не па гадах разумная дзяўчына вырашае звязаць свой лёс са служэннем Богу і сваайму краю. Што памкнула яе да гэтага? У кожнага мастака свая разгадка гэтай таямніцы. Напрыклад, даследчык «Жыція…» А.Мельнікаў лічыць, што княгіня Раманава, бачачы, што хрысціянства страчвае на паўязычніцкай Полаччыне свае пазіцыі без моцнай княжацкай падтрымкі, угаворвае Прадславу на пострыг. Ірына Багдановіч мяркуе, што дзяўчына пайшла ў манастыр, «зведаўшы плён пазнання». Для У.Арлова пострыг Прадславы – бунтоўнае адмаўленне ад бясслаўнай долі ўдзельнай княгіні. Т.Бондар у рамане «Спакуса» матывуе выбар князёўны прагай «славы,

…улады над іх /людзей/ душамі», якая павінна трымацца на на «пакаянні і любові іх». Л.Забалоцкая, заглыбляючыся ў інтымны свет лірычнай гераіні, звязвае яе ўчынак з няўдалым каханнем:

Над зямлёй павіс
Манашкі плач,
Над стагоддзямі,
Над церамамі:
«Селянін мяне кахае,
мама,
Самы добры ён,
Ты мне прабач…
З ім шчаслівай буду,
Больш ні з кім!» --
Крык адчайны, як
званы ў нягоду…(201)

В.Іпатава ў рамане «Прадслава» ажыўляе гэтага селяніна, дае яму імя -- Раман. Менавіта са з'яўленнем гэтага персанажа пераклікаюцца ў творы душэўныя пакуты юнай закаханай Прадславы,а потым мудрай, крыху расчараванай у жыцці ігуменні Ефрасінні.

Адказаў шмат. Ды толькі хто праз яснае ззянне спраў святой Ефрасінні ўбачыў яе сапраўдную душу?

1113(1114)—1128г.г.

І вось, 25 верасня, у дзень св. Ефрасінні Александрыйскай, перад абразам Чанстахоўскай Божай Маці пострыг адбыўся. Прадслава была хрышчана Ефрасінняю, што значыць «радасць». Сапраўды, яна стала радасцю і ўцехай нашай зямлі. «Всех преспевающи постом и молитвами и бдении нощным», навучылася яна ў сценах манастыра «безстрастию телесному, говеянию образну, ступанию кротку, гласу смиренну, слову благочинну, ядению и питию безмолвну; при старейшей молчати, мудрейших послушати, к старейшим покорение,к точным /роўным/ и меньшим любовь без лицемериа; мало вещати, а множае разумети». У келлю-«галубніцу» Сафійскага сабора да яе прыходзяць і ўзвышаныя словы новых малітваў, грэшныя відовішчы сноў з таго, другога, жыцця. Але побач заўсёды настаўнікі, суддзі і нямыя сведкі яе пакут – кнігі, перагартаныя, перапісаныя яе рукой і прачутыя сэрцам да апошняй літары. Некаторым з іх давядзецца стаць першай азбукай для той полацкай дзяўчынкі ці хлопчыка, хто, магчыма, калі вырасце, з вучня манастырскай школы стане Скарынам, Полацкім, Цяпінскім і раскажа ўсяму свету пра сваю шчодрую зямлю. Як бачым, выбар Ефрасінняй другога паміж тым, што жанчыне «належыць болей – сваё /дзіця/ радзіць?/ Вучыць чужое?» (Л.Рублеўская), дае свой плён і праз стагоддзі.

1128—1150г.г.

Насельніцы сучаснага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра (іх зараз 65) расказваюць, што ў сне ў келлю на Сафійцы да Ефрасінні тройчы прыходзіў анёл, браў яе за руку, вёў у недалёкае Сяльцо і прамаўляў:”Тут належыць быць табе!” Пачуў Божае слова тагачасны Полацкі епіскап Ілля і ў прысутнасці князёў Барыса і Святаслава абвясціў:”Се отдаю Еуфросинии место святаго Спаса при вас, да по моем животе никто же не посудит моего дания».

Перыяд будаўніцтва жаночага манастыра быў адным з самых плённых у пажзвіжніцкай дзейнасці Ефрасінні.У гэты час па загадзе (ці просьбе) ужо тады вядомай ігуменні прыбыў з Бельчыцкага манастыра ў Полацк дойлід Іаан. Манахіні апавядаюць, што быццам бы кожнага досвітку, пакуль архітэктар не прыняўся за будаўніцтва храма, да яго гучаў нечы голас, што клікаў увасобіць славу Божую ў камені. Гэты твор мастацтва -- першы каменны помнік дойлідства ўсходніх славян – напаткае незвычайны лёс: «…сабор, што на грудзях маіх /Ефрасінні/, як на грудзе зямным, стаяў, не пахіснуўся. Дрэвы хісталіся і падалі, шляхі наўстырч уставалі, скукожваліся, азёры з берагоў сваіх, як з чараў, у вецер выплёскваліся , а ён – стаяў. Адно падножжа сям-там мохам пабралася, адно тынкоўка сям-там сівым пылком абляцела, асыпалася». Рэдкасцю было і ўнутранае ўбранства царквы: яе сцены ўпрыгожвалі дзівосныя фрэскі, на адной з якіх, як лічыцца, мастак увасобіў аблічча самой гуменні. Ці ёю быў зроблены заказ, ці не, зараз невядома.

Наследуючы гістарычнай логіцы і мастакоўскай інтуіцыі, С.Тарасаў у мініяцюры «Фрэскі» паказвае магчымы варыянт развіцця падзей. Адзін з галоўных герояў -- майстар Лукаш -- асмельваецца без дазволу строгай ігуменні пісаць яе лік. Таксама ўпотай піша ікону Божай Маці з тварам Ефрасінні Іаан у рамане В.Іпатавай «Прадыслава». Думаецца, што мастацкая праўда гэтых твораў недалёка ад ісціны.

Апісаныя вышэй фрэскі сталі ўзорам для іканапісцаў. Так, сучасная ікона св.Ефрасінні адлюстроўвае яе ў поўны рост на воблаку, якое лунае над Полацкам. У правай руцэ яна трымае крыж, у левай – белую лілею як сімвал цнатлівасці, бязгрэшнасці. Вышэй светазарнага вянца над галавою святой анёлы трымаюць карону. Фрэскавая традыцыя трапіла разам з гравюрай XIXст. у беларускае замежжа (Германію, Францыю, ЗША, Аўстралію і інш.). На сённяшні дзень кожная царква на эміграцыі мае ікону нацыянальнай святой. У Германіі – гэта лік работы Л.Каліноўскай, у ЗША – К.Бандарука, З.Чайкоўскага. Дакладна вядома, што выява Ефрасінні Полацкай да гэтага часу захавалася на сцяне падземнай царквы Звеставання ў Кіева-Пячэрскай лаўры (аўтар В.Васняцоў). Такім чынам, памяццю духоўнага служэння Ефрасінні ў Сяльцы стаў не толькі храм Спаса, а і старажытныя фрэскі.

1150—1167(1173)г.г.

Працягваючы шчыраваць у створанай ёю абіцелі, Ефраніння бярэцца за новую пачэсную справу – будаўніцтва Багародзіцкай царквы і заснаванне мужчынскага манастыра.

Для цырымоніі адкрыцця апошняга яна просіць канастанцінопальскага патрыярха Хрысаверга «адпусціць з Царграда» адну з трох ікон Адзігітрыі – Эфескую, -- напісаную евангелістам Лукой пры жыцці Божай Маці. Візантыйскімі майстрамі была створана копія Царградскага абраза, якая пазней стала ўзорам мясцовай школы іконапісу. Зараз рэліквія (яна яшчэ мае назвы Карсуньская, Тарапецкая – па месцах,

дзе знаходзілася) знаходзіцца ў Рускім музеі Санкт-Пецярбурга. Выява Дзевы Марыі хаваецца на ёй пад слаямі пазнейшых фарбаў і бачна толькі з дапамогай электронна-аптычных прыбораў.

Для новага манастыра быў заказаны Лазару Богшу вядомы Крыж Ефрасінні Полацкай. Яго значэнне для вернікаў можна ацаніць, толькі ўсвядоміўшы, якія хрысціянскія каштоўнасці разам з кіпарысавым дрэвам былі ўкладзены пад залатыя і срэбныя пласціны твора ювелірнага мастацтва. Гэта кроў Хрыстова, дрэва Жыватворчае, часцінкі Гроба Гасподняга, Гроба Багародзіцы, кроў св.Дзмітрыя, мошчы св. Стэфана і Панцеляймона. Асаблівую каштоўнасць помніку надае тое, што, паводле Г.Лаўрэцкага, пры яго вырабе за аснову метрычнай сістэмы была ўзята далонь самой Ефрасінні Полацкай.

Агульнавядома, што Крыж знік у час Вялікай Айчыннай вайны пры эвакуацыі органамі ОГПУ каштоўнасцей Беларусі на ўсход. Росшукі святыні ў прыватных калекцыях ЗША плёну, на жаль, не далі. Па здымках і малюнках пачатку стагоддзя брэсцкім майстрам М.Кузьмічом у 1997г. была створана копія Крыжа Ефрасінні Полацкай. Інакіні Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра расказваюць, што нават з копіяй святыні адбываюцца цуды. Так, калі М.Кузьміч доўгі час не мог аднавіць старажытную тэхніку перагародчатай эмалі, спосаб яе вырабу прысніўся майстру, прычым пасля заканчэння працы ювелір не змог яго ўспомніць. Самым пераканаўчым сведчаннем цудадзейнай сілы Крыжа ў манастыры лічаць тое, што за час работы над святыняй М.Кузьміч прыйшоў да Бога.

Напрыканцы жыцця, яшчэ да адпраўлення ў Царград і Іерусалім, слынную і ўплывовую ігуменню запрашаюць хрысціць дачку полацкага князя Рагвалода Барысавіча, якая стане першай ігуменняй манастыра ў Пскове і будзе кананізавана таксама з імем Ефрасіння. Другая хрэсніца нашай святой, дачка галіцкага князя Яраслава Асмамысла, у будучым стане вядомай ўсяму свету як Яраслаўна са «Слова пра паход Ігаравы». Пострыг ад полацкай ігуменні, праўда, без згоды бацькоў, прынялі яе малодшая сястра Гарадзіслава (у манастве Еўдакія), стрыечная сястра Звеніслава (Еўпраксія), з якою ігуменння была «яко едина душа въ двою телесу», а таксама пляменніцы Кірыяна (Еўфімія) і Вольга (Агафія). Зрабіўшы ўсё, што магла, Ефрасіння з братам Давыдам і сястрой Еўпраксіяй адпраўляецца ў падарожжа. Дапяўшы Святой Зямлі, асветніца, прахварэўшы 23 дні, просіць прынесці ёй вады з ракі Іярдан. Калі яна адчула блізкі скон, то паклікала святара, устала, паспавядалася, прыняла прычасце, пакланілася тройчы, легла і, склаўшы рукі, адышла.

Амаль адразу пасля яе смерці, у XIIст., задоўга да кананізацыі ў 1547г., магчыма, некім з акружэння «слугі» Міхаіла, які добра ведаў асветніцу, было напісана першае «Жыціе прападобнай Ефрасінні, ігуменні Полацкай». Зараз захаваліся толькі пазнейшыя спісы з яго, сярод якіх А.Мельнікаў вылучае:

- Спісы зборнікаў жыцій святых змяшанага складу (каля чатырох варыянтаў тэксту).
- Спісы Ступеннай кнігі царскага радаслоўя XVIст. (каля трох варыянтаў тэксту).
- Спісы Кнігі жыцій святых Дзмітрыя Растоўскага XVIIст.
- Спісы 12-томных Вялікіх Міней чэццїх мітрапаліта Макарыя XVIст., дзе, нягледзячы на аздобу і вычварнасць стылю, ёсць істотны недахоп – адсутнічае т.зв. "пахвала" Ефрасінні.

Менавіта словы пахвалы да гэтага часу выклікаюць спрэчкі, а іменна выраз "яко луча/луна солнечная". Вялікую групу складаюць даследчыкі, якія лічаць правільным варыянт "луна". Гэта лінгвісты, А.Лойка, М.Ермаловіч, прычым апошнія бачаць у дадзеных словах непасрэдную сувязь са Скарынавай эмблемай "сонца маладзіковага", а мовазнаўцы – з беларускім словам "лунаць", з польскім "luna" (ззянне, зарыва). Другія, як, напрыклад, А.Тыртаў, У.Арлоў схіляюцца да варыянта "луча" (прамень), якое сімвалізуе духоўную значнасць подзвігу святой. Нам уяўляецца больш абгрунтаваным выбар слова "луна".

Пасля смерці апякункі Беларусі засталіся не толькі творы мастацтва, жыціі, але і людская памяць, любоў. Менавіта гэтыя пачуцці прымусілі хрысціян вынесці з захопленай егіпецкім султанам Саладзінам Святой Зямлі мошчы яшчэ не прызнанай святою Ефрасінні, перанесці і ўрачыста захоўваць іх у Кіева-Пячэркай лаўры. На Радзіму "средний перстъ десныя руки» трапіў толькі ў 1870г., а поўнае перанясенне мошчаў адбылося ў маі 1910г. З Оршы да Кіева срэбная рака пад спецыяльна зробленым на параходзе балдахінам плыла 695 вёрст па Дзвіне. Людзі па берагх палілі вогнішчы, чакаючы, калі ўрачыстая флатылія будзе праплываць міма, уваходзілі ў ваду, каб атрымаць блаславенне ці вылечыцца. Ад Оршы да Полацка мошчы везлі сухазем'ем. Каля Віцебскай заставы іх сустракаў жывы калідор у дзве вярсты, у якім стаялі і каралева Грэцыі Вольга, родная сястра царыцы вялікая княгіня Елізавета, вялікі князь Канстанцін. На тым шляху, дзе праходзла працэсія, вакол Ефрасінні адбываліся дзівосы: вылечванне мірам, лампадным маслам, прыкладзеным да ракі, слепаты, вар'яцтва, паралюша, язваў, хвароб ног і скуры. У тыя гады а.А.Чарапнін сабраў каля пятнаццаці пісьмовых сведчанняў аб падобных цудах.

У 1922г. мошчы былі ўскрыты і асведчаны савецкай камісіяй у прысутнасці манахінь Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. У заключэнні камісіі ўказвалася, што "труп подвергся почвенной мумификации» накшталт егіпецкіх мўмій, але, у адрозненне ад іх, без спецыяльнага бальзаміравання. Ацалелыя косці былі адпраўлены ў Маскву на атэістычную выставу, пазней – у Віцебскі краязнаўчы музей. Падчас акупацыі фашысцкімі ўладамі быў дадзены дазвол на вяртанне мошчаў у абіцель. З тых часоў дух-прывід Ефрасінні жыве ў манастыры: расказваюць, што цень ігуменні можна ўбачыць у храме і каля яго ў выглядзе схіленай у малітве жанчыны, ён крочыць па двары і бласлаўляе тых, хто просіць.

Каля васьмі стагоддзяў святая апякуецца над беларусамі. Калі ў XIIст. яна была міратворцай і спыняла міжусобныя войны, то і ў наш час яе памяць служыць аб'яднанню вернікаў розных канфесій – яна прызнана святой і праваслаўнымі, і каталікамі, і уніятамі. З дзейнасцю гэтай незвычайнай жанчыны звязана з'яўленне на Беларусі першых адукацыйных установ, стварэнне школы архітэктуры і жывапісу, развіццё рамёстваў, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, бібліятэчнай справы. Мяркуецца, што пры манастыры вялося Полацкае летапісанне, ды і сама Ефрасіння пісала арыгінальныя творы, перакладала з грэчаскай і лацінскай моў, пашыраючы абсягі славянскай кнігі. Яе духоўны подзвіг натхняў і натхняе нашчадкаў несці промні асветы людзям сваёй зямлі, як гэта рабілі Іаан, Лазар Богша, Сімяон Полацкі. Апошні згадвае асветніцу ў «Прилоге к преподобной матери Ефросинии» такімі словамі:

Ты паки мати, о Ефросиние,
Жителей града всих удобрение…(232)

Пакутніцы прысвечаны пеўчы цыкл XIIст., які захаваўся ў асноўным у спісах XVI -- XVIIIст.ст., а адна сціхіра – у спісе XIIст. Не абышлі яе ўвагай і нашы сучаснікі. Вобраз патронкі Беларусі ўвасоблены ў жывапісных работах А.Марачкіна і Н.Шчаснай, у графіцы А.Кашкурэвіча і В.Вярцейкі. На Верхнім замку ў Полацку, недалёка ад помніка Францішку Скарыну, увосень 2000г. з'явілася бронзавая, у поўны рост, скульптура маладой ігуменні, якая быццам бы толькі сышла са старажытнай фрэскі. Тут, у "беларускім Іерусаліме", і іншых месцах, звязаных з жыццём славутай палачанкі, В.Моракавай зняты дакументальны кінафільм-эсэ "Ефрасіння Полацкая". Кожны год Усебеларускі жаночы Фонд Ефрасінні Полацкай уручае лаўрэату звання "жанчына года" медаль імя асветніцы. Памяць нашай апякункі ўшаноўваецца беларусамі і на эміграцыі – у ЗША (Таронта, Саўт-Рывер), Вялікабрытаніі (Лондан), Германіі (Рэгенсбург) пабудаваны храмы ў гонар святой, напісаны яе лікі.

Але, бадай, самы значны ўплыў духоўнай справы Ефрасінні зазнала літаратура. Жывое славянскае слова, над распаўсюджаннем якога так шчыравала наша зямлячка, прарасло яе імем у літаратурных творах XXст..
Яркі вобраз той, якая "для ўсіх была ўсім", пасля доўгай афіцыйнай забароны, -- калі ў Парыжы, Кліўлендзе, Лондане аб ёй друкавалася больш, чым на Радзіме, -- зноў заззяў сваёю веліччу на крывіцкай зямлі. Другое адкрыццё імені Ефрасінні Полацкай адбылося ў 1970-я г.г. і звязана з работамі М.Ермаловіча, М.Прашковіча, Г.Штыхава. Па працах к.XIX—п.XXст. М.Дуброўскага (Полацк,1887г.), А.Тыртава (Віцебск,1893г.), М.Кайгародава (Санкт-Пецярбург, 1910г.), М.Зорына (Санкт-Пецярбург, 1910г.), Я.Пасяляніна (Санкт-Пецярбург, 1910г.), М.Чарапніна (Віцебск,1912г.) і Л.Гарошкі (Парыж,1945г.) яны крок за крокам спасцігалі праўду аб полацкай ігуменні. Гэта пачэсная справа была працягнута даследчыкамі новага пакалення У.Арловым, А.Мельнікавым, Л.Аляксеевым, В.Коўтун, І.Багдановіч і інш.

Праца з матэрыяламі аб Ефрасінні, наведванне яе радзімы прыносіць глыбокае эмацыянальнае ўзрушэнне, выклікае творчы энтузіязм, бо да такога лёсу немагчыма застацца абыякавым. Таму не дзіўна, што чуйныя сэрцы паэтаў і празаікаў дружна адгукнуліся на вяртанне святога імя сваімі творамі. Да апошняга часу вершы, аповесці і апавяданні былі рассыпаны па шматлікіх перыядычных выданнях. У 1998г. у серыі "Бацькаўшчына" выйшаў зборнік гістарычнай літаратуры пад умоўнай назвай "Кніга Прадславы", дзе ўкладальнікам, С.Панізнікам, сабраны найбольш значныя і цікавыя мастацкія і публіцыстычныя творы, прысвечаныя нашай зямлячцы. Зборнік адкрываецца "Калядным пасланнем Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта" 1997 -- 1998г.г. з нагоды надзвычайнай падзеі – вяртання на беларускую зямлю "Крыжа прападобнае маці нашае Еўфрасінні, ігуменні Полацкай".

Прадмова да "Кнігі Прадславы" належыць укладальніку і прысвечана тэме ўстанаўлення гістарычнай справядлівасці – вяртання слаўнага імені полацкай князёўны Прадславы.

Матэрыял у зборніку размеркаваны паводле жанравай прыналежнасці па трох рвздзелах:

1. "Пуцяводная зорка" (проза і драматургія).
2. "Малюся я небу, зямлі і прастору…" (паэзія).
3. "Не пакіну вас…" (публіцыстыка).

Якою ж паўстае перад намі Прадслава-Ефрасіння ў гэтых творах? Трэба адзначыць, што вобраз жанчыны-падзвіжніцы складаецца супярэчлівы: кожны з аўтараў бачыць унутраны свет палачанкі адметна, арыгінальна, па-свойму.

Т.Бондар (раман "Спакуса") уяўляе сваю гераіню мужнай і нязломнай у дасягненні высокіх мэт, з "палкім, бясстрашным позіркам". У ёй жыве рашучасць і непрымірымы бунтоўны агонь: "…сілу ў сабе чую большую, чымсьці жанчыне мецЬ дазволена, і ўсю сілу гэту я богаўгодным справам аддаю, на карысць люду полацкаму і ў славу яго…" – кажа маладая Ефрасіння. Твор Т.Бондар – гімн чалавечай мэтаімкнёнасці, альтруізму і адданасці справе.

Для В.Іпатавай (раман "Прадыслава") найбольш важным з'яўляецца раскрыццё на фоне вялікіх падзей асабістага, інтымнага свету жанчыны, якая прынесла ў ахвяру сваім перакананням усе маладыя сілы, прыгажосць і плён рэдкага розуму. Раман напоўнены псіхалагічнымі дэталямі і ўнутранымі маналогамі, бытавымі замалёўкамі і сімвалічнымі асацыяцыямі. Так, калі у згаданым творы Т.Бондар храм Спаса набывае значэнне маўклівага помніка неўміручым справам Ефрасінні, то ў В.Іпатавай – ён хутчэй духоўнае дзецішча дойліда Іаана і ігуменні: "Хорам, які вырас на беразе Палаты, быў для яго /Іаана/ як дзіця". У "Прадыславе" побач з жывмі мастацкімі падрабязнасцямі, вобразнымі, выразнымі сцэнамі, высвечваецца сапраўдная сутнасць і значнасць духоўнай ахвяры галоўнай гераіні.

У творах, разгледжаных вышэй, за аснову ўзяты сюжэт "Жыція…" А.Лойка ў рамане-эсэ "Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае" вылучае на першы план не столькі жыццёвы шлях полацкай князёўны, колькі яго значымасць для сталення наступных пакаленняў. Вобраз асветніцы ў свядомасці юнага Францішка зліваецца з вобразам яго маці, што вымагае ад чытача больш шырокага абагульнення: ігуменння-кніжніца з'яўляецца не толькі промнем вучонасці для хлопчыка, але і духоўнаю маці Скарынавага (значыць, і ўсходнеславянскага) кнігадруку. Відзенні святой, што налучаюць маленькага Скарыну ў хвіліны эмацыянальнага ўзрушэння, – светач, які прывядзе Францішка да адданага служэння "людем посполитым».

Апавяданне С.Тарасава «Фрэскі» яднае з творам В.Іпатавай тое, што падзвіжніцтва Ефрасінні паказваецца на фоне асабістых перажыванняў галоўных герояў. Як і ў эпізодзе з дзяўчынкай Прадыславай з рамана В.Іпатавай, якая разам з маці просіць ратунку у манастыры, у творы празаіка побач з ігуменняй дзеці, іх незамутнёнае, чыстае ўспрыняцце людзей і свету. Іх вачам адкрываецца сутнасць, існасць душы асветніцы, яе прыхаваная пяшчота і цеплыня ў адносінах да малых як нечага няспраўджанага ў жыцці. Для чытача так і застаецца загадкай, што іменна «ніяк не клалася на словы… трымцела, штурхала малечае сэрца, ірвалася вонкі», калі на хлопчыка Андрэйку зірнула з фрэскі святая. Гэта была сіла мастацтва, ці лунаў у паветры боль страчаных закаханым ў манахіню Лукашом надзей, або такое ўражанне сваралі дзівосныя вочы Ефрасінні?

Раздзел паэзіі адкрываецца невялікім, але змястоўным артыкулам У.Гніламёдава «Традыцыі Прадславы ў беларускай паэзіі», у якім аўтар разглядае вершы В.Ластоўскага «Дума на Полацкім замчышчы», А.Мінкіна «Сафійскі сабор», Л.Геніюш «Ефрасіння Полацкая», Л.Тарасюк «Ефрасіння. XIIст.», В.Зуёнка «Сутнасць», А.Звонака «Беларускія жанчыны», Д.Бічэль-Загнетавай «Ефрасіння Полацкая», Н.Арсенневай «І была там вясна», Р.Барадуліна «Мальба».

Імкненне лірыка пранікнуць у патаемны свет героя вядзе да раскрыцця яго, паэта, уласнага светабачання. Не сакрэт, у кожнага аўтара, як і ў кожнага чалавека, сваё, унікальнае, непаўторнае ўспрыняцце навакольнага. Але ўсё ж такі, чытаючы паэзію, адчуваеш, «мужчынская» яна ці «жаночая». Паэзія, адметная лагічным, інтэлектуальным пачаткам, звычайна належыць мужчынам і апявае, у асноўным, славу і здзяйсненні, патрыятызм і падзвіжніцтва палачанкі, як, напрыклад, у В.Лукшы (верш «Фрэскі»):

Ўскрыліла над зямлёю Ефрасіння
Асветніцай,
Пакутніцай,
Святой.(211)

Рэфрэнам гучыць сцвярджэнне неўміручасці справы ігуменні ў творы А.Лойкі «Ефрасіння Полацкая»:

Мір табе, Ефрасіння!..
Посах твой не прыстане…(210)

У вершы «Апошняя малітва Ефрасінні Полацкай» В.Зуёнка таксама на першы план выступае палымяны патрыятызм лірычнай гераіні:

…Я лячу да цябе, Радзіма,
Са святога Ерусаліма…( 203)

М.Кавыль у творы «Божа наш» семантычна зближае вобразы маці і Радзімы:

Каб з душой Святое Ефрасінні
Выйшла ў людзі Маці-Беларусь!

Жаночае ўспрыняцце свету больш пачуццёвае, эмацыянальна афарбаванае. Паэтэсы засяроджваюцца не толькі на дасягненнях і поспехах беларускай святой, а і на асабістых перажываннях, унутраных рухах душы гераіні. Так, Я.Мальчэўская заўважае, «як струменіцца смутак з Ефрасінні вачэй»(227) (верш «Ноч у Полацку»). У Л.Забалоцкай чытаем, што «Ефрасінні Полацкай акно безнадзейным пазірае вокам», што «не ў радасць церамок /манастыр/ дзяўчыне»(201), бо шчасліваю яна магла стаць толькі побач з каханым. Да мастацкага абагульнення ролі жанчыны ў свеце ўздымаецца ў баладзе «Ефрасіння» Л.Рублеўская, натхнёная слаўным шляхам беларускай святой:

Жанкі!
Такі наш выбар будзе
Паўсюль, няўмольна і адвечна:
Ці – крыж на маладыя грудзі,
Ці – церам з цемрай чалавечай.(235)

Выхад з «церама цемры» нам указала асветніца – гэта шлях да Бога, да яго Слова. Д.Бічэль-Загнетава гаворыць аб ім наступнымі словамі:

Беларусь – Ефрасіння Святая,
памаліўшыся на раздарожжы,
павярні свае вочы да Божых --
Добры Божа Цябе прывітае.(195)

Судакрананне вобразаў Радзімы і маці, як і ў А.Лойкі, М.Кавыля, В.Зуёнка, прысутнічае і ў згаданым творы, але з акцэнтам на самаахвярную мацярынскую любоў Беларусі.

Асаблівай меладычнасцю, яркай вобразнасцю, знаходкамі ў плане выражэння вызначаюцца песні пра Ефрасінню С.Панізніка, У.Пецюкевіча, Л.Дранько-Майсюка, тэксты якіх прадстаўлены ў раздзеле.

Такім чынам, з паэтычных твораў перад намі паўстае асветніца, падзвіжніца, духоўная маці нашай зямлі, непакорная дачка і мужная жанчына з нялёгкім, але незвычайным і слаўным лёсам.

Публіцыстычныя творы, змешчаныя ў зборніку, заслугоўваюць асаблівай увагі з той прычыны, што даюць разнастайны, багаты матэрыял пра жыццё і дзейнасць Ефрасінні і яе сучаснікаў.

Найбольш змястоўнае і аб'ёмнае даследаванне «Нібы прамень сонечны» належыць пяру У.Арлова -- яно ўтрымлівае дакументы, успаміны,

спасылкі, каштоўныя развагі аўтара-гісторыка і ў той жа час вызначаецца выразным публіцыстычным пафасам. Аналагічны па падачы матэрыялу ўступны артыкул І.Багдановіч «Ефрасіння Полацкая».

Багаты звесткамі па гісторыі Беларусі і суседніх краін нарыс Г.Запартыка «Не пакіну вас…». Непасрэднымі жывымі ўражаннямі напоўнены нататкі падарожніка «Беларусь – зямля святая» В.Шымановіч і «Паломніцтва ў Полацак – гэта шлях да вытокаў, шлях да саміх сябе» І.Ждановіча. Праблеме сувязі дзейнасці Ефрасінні Полацкай і жаночага руху на Беларусі прысвечана эсэ В.Коўтун «Нацыянальная святыня». Набліжаны да апавядання публіцыстычны твор А.Кудрашова «…Кожнага памілуй і ад бяды пазбаў». Чытачам-дзецям адрасаваны нарыс А.Марціновіча «Ефрасіння Полацкая». Форма выкладу ў ім цікавая і даступная.

Мы ўпэўнены, што чытачы не застануцца абыякавымі да «Кнігі Прадславы» і для тых, каго зацікавіў вобраз нябеснай апякункі Беларусі, прыводзім ніжэй спіс літаратуры аб ёй.

## **МЕТОДЫКА І ВОПЫТ**


1. Ананчанка Л. ”Тым, хто імкнуўся да кнігі, свяціла б зорка”: Выхаваўч. работа ў дашк. уст. // Чырвоная змена.—1996.—17 крас.
2. Каяла У. І. Жыціе Ефрасінні Полацкай – першае жыціе старажытнабеларускай літаратуры: Камбін. урок у 10 кл. // Беларуская мова і літаратура.—1996.—Вып 2.
3. Капцэвіч К.А. Спеў аб Еўфрасінні: Сцэнарый літ.-муз. вечарыны, прысв. Еўфрасінні Полацкай // Роднае слова.—1994.--№7-8.
4. Сухадолава В.У. Славутая наша зямлячка: Віктарына пра Ефрасінню Полацкую. // Беларуская мова і літаратура ў школе.—1991.--№10.


## *НАСТАЎНІКУ ПРА ЕФРАСІННЮ ПОЛАЦКУЮ*


1. Абецедарский Л. Нужны точные оценки (Против идеализации роли в просветительстве Ефросинии Полоцкой, Мелетия Смотрицкого, Лаврентия Зизания и др.) // Советская Белоруссия.—1973.—17 мая.
2. Брыгадзін П. Сусветна вядомая асветніца Ефрасіння Полацкая: Навук.-метад. рэкаменд. для наст. // Настаўніцкая газета.—1996.—3 крас.
3. Лойка А.А. “Хай спраўдзіцца воля Бога”: Аповесць пра жыццё Еўфрасінні Полацкай: У дап. наст. бел. літарат. // Роднае слова.—1996.--№2.
4. Мельнікаў А. Еўфрасіння Полацкая // Настаўніцкая газета.—1989.—2 жн.
5. Мельнікаў А.А. Да пытання аб стылявых адметнасцях жыція Еўфрасінні Полацкай // Беларуская літаратура.—1990.—Вып.18.
6. Мельнікаў А.А. Топас і запазычанні ў “Жыціі Еўфрасінні Полацкай” // Весці АН БССР. Сер. грам. навук.—1989.--№4.


## *НАГЛЯДНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ*


1. Багданава Т.Е. Ефрасіння Полацкая // Беларусь.—1996.--№8. (Партрэт)
2. Іпатава В. Прадслава // Звязда.—1990.—Май. (Сувенір. спец. вып.).
3. Кузьмич А. Плач Ефросиньи Полоцкой, 1990 // Гаспадыня.—1997.--№1.

4. Свентахоўскі П. Ефрасіння Полацкая, 1992. Алей // Мастацтва.—1992. (Партрэт)

*Д З Е Ц Я М  П Р А  Е Ф Р А С І Н Н Ю  П О Л А Ц К У Ю*

1. Арлоў У. Нібы прамень сонечны… // Пачатк. школа.—1992.—№1,№2.
2. Гісторыя беларускай літаратуры ў пытаннях і адказах // Наша слова.—1993.—9 чэрв.(№23),7 ліп.(№27), 14 ліп.(№28), 21 ліп.(№29), 28 ліп.(№29).
3. Марціновіч А. Святая Ефрасіння: Нарыс: Для мал. школьнікаў.—Мн., 1999.
4. Тарасаў С. Прадслава // Вясёлка. —1989.--№4.
5. Тарасаў С. Фрэскі  // Карані: Аповесці. Апавяданні.—Мн.,1994.
6. Хто такая Еўфрасіння Полацкая ?: З гісторыі Беларусі // Ніва.—1995.—11 чэрв.(№24).— (Зорка: Старонка для дзяцей).
7. Ягоўдзік У. Крыж-святыня // Вясёлка.—1996.--№2.

*М А Л І Т В Ы*

1. Акафист преподобной Евфросинии Полоцкой.—Мн.,1998.
2. Акафист преподобной матери нашей Евфросинии Полоцкой.—Полоцк,1990.
3. Молитва к преподобной Евфросинии Полоцкой // Навіны ветэрынарнай медыцыны.—1994.—Снеж.(№4).

*Ж Ы Ц І І*

1. Аповесць жыція і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Ефрасінні, ігуменні манастыра св. Спаса і Найсвяцейшай яго Маці, што ў горадзе Полацку. Благаславі, Ойча! / Пер. са ст.-руск. А. Мельнікава // Спадчына.—1989.--№1.
2. Кніга жыцій і хаджэняў.—Мн.,1994.

3. Житие преподобной Евфросинии, игумении Полоцкой // Москва.—1991.--№6.
4. Житие преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой.—Витебск,1888.
5. Житие преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой.—Полоцк,1887.
6. Житие преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой.—Полоцк,1871.
7. Исторические сведения о жизни преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой.—СПб.,1841.

8. Дубровский М. Житие Преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой, с кратким описанием основанного ею в Полоцке женского монастыря.—Полоцк,1887.
9. Тыртов А.П. Некоторые пояснения к описанию жития преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой.—Витебск,1893.

*М А Н А Г Р А Ф І І*

1. Арлоў У.А. Асветніца з роду Усяслава.—Мн.,1989. (Таксама гл. Полымя.—1989.--№10., Чырв.змена.—1989.—28 студз.)
2. Арлоў У. Еўфрасіння Полацкая.—Мн.,1992.
3. Гарошка Л. Св.Еўфрасіння-Прадслава, патронка Беларусі.—Мн.,1996.
4. Глыбінны У. На святой зямлі.—Лондан,1972.

5. Алексеев Л.В. Преподобная Евфросиния Полоцкая: (Жизнь, детельность, судьба) // Веснік Бел. Экзархата.—1994.—1995.--№1-2.
6. Зорин Н. Преподобная Евфросиния, княжна Полоцкая.—СПб,1910.
7. Кайгородов Н. О достопамятных Свято-Евфросиниевских днях в Полоцке 20-23 мая 1910г.—СПб,1910.
8. Поселянин Е.Н. Преподобная Евфросиния, княжна Полоцкая.—СПб.,1910.
9. Черепнин Н. Чудесные знамения от св. мощей Преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой.—Витебск,1912.

10. Byelorussian Greek Orthodox Church of St.Euphrosynia.—South River,1968.

*У ЗБОРНІКАХ /артыкулы і згадкі /*

1. Адраджэнне: Гістарычны альманах.—Мн.,1995.—Вып.1.
2. Марціновіч А. Зерне да зерня.—Мн.,1996.
3. Масляніцына І.А., Багадзяж М.К. Слава і нягслаўе.—Мн.,1995.
4. Матэрыялы па гісторыі Беларусі.—Мн.,1998.
5. Пагутарым аб новых кнігах.—Мн.,1999.
6. Шляхам гадоў: Гіст.-літ. зб.—Мн.,1993.

7. Теоретические, исторические и методические аспекты изучения литературы.—Мн.,1997.
8. Из тьмы веков светлеющие лики: Сб.—Мн.,1994.

*У М А С Т А Ц К А Й Л І Т А Р А Т У Р Ы*

1. Асіпенка А. Святыя грэшнікі: Раман. Абжыты кут: Аповесць.—Мн.,1997.
2. Бацькаўшчына: Зб. гіст. літ.: Кніга Прадславы.—Мн.,1998.
3. Бічэль-Загнетава Д. Ефрасіння Полацкая: Вершы // Беларусь.—1988.--№1.
4. Бондар Т.М. Спакуса.: Раман.—Мн.,1989.
5. Зуёнак В. Апошняя малітва Ефрасінні Полацкай: Верш // Полымя.—1994.--№5.
6. Жуковіч В. Ефрасіння Полацкая: Верш // Наст. газ.—1994.—18 мая.
7. Лукша В. У Полацкім музеі кнігадруку. Фрэскі: Вершы // Маладосць.—1996.--№2.
8. Пазняк З. Спеў аб Ефрасінні Полацкай: Пеўчы цыкл XIIст. // ЛіМ.—1988.—12 лют.(№7).
9. Панізнік С. Ефрасіння: Вершы // Звязда.—1992.—15 мая.
10. Піваваp Л. Прападобнай Еўфрасінні Полацкай: Верш // Навіны ветэрынарнай медыцыны.—1998.—снеж.(№8).
11. Пракаповіч М. Крыж Ефрасінні Полацкай: Верш // Народная трыбуна.—1998.—31 кастр.
12. Сіманёнак Л. Еўфрасінні Полацкай: Верш // Выбар.—1995.—чэрв.(№4).
13. Чыркова Е. Малітва Св. Ефрасінні: Верш // Преображение.—1999.—март(№3).
14. Шпыркоў А. Вяртанне Ефрасінні: Вершы // Віцебскі рабочы.—1992.—19 лют.

15. Гордеева Г. Стихи // Преображение.—1999.—июнь(№6).
16. Пехтерев И. Помолись, о Мати Ефросиния!: Стихи // Веснік Магілёва.—1998.—6 студз.(№1).

*А С О Б Н Ы Я   П У Б Л І К А Ц Ы І*


1. Божым шляхам.—1950.--№2-3.
2. Божым шляхам.—1949.--№3,4,5,6,7,8,9,10.
3. Царкоўнае слова.—1997.--№6.
4. Царкоўнае слова.—1993.--№12.

5. Гродненские епархиальные ведомости.—1998.—дек.(№12).
6. Гродненские епархиальные ведомости.—1998.—май(№5).
7. Минские епархиальные ведомости.—1998.—февр.(№2).
8. Могилевские епархиальные ведомости.—1993.—июнь(№6).
9. Полоцкие епархиальные ведомости.—1998.—авг.(№8)
10. Полоцкие епархиальные ведомости.—1999.—сент.(№9).
11. Полоцкие епархиальные ведомости.—1998.—июнь(№6).
12. Преображение.—1996.—июнь(№6).

13. Алеся.—1998.--№8.
14. Беларуская думка.—1993.--№1.
15. Беларусь.—1999.--№3.
16. Беларусь.—1973.--№5.
17. Беларусь.—1945.--№2.
18. Гаспадыня.—1998.--№1,2,3,4.
19. Голас Радзімы.—1993.—28 кастр.(№43), 4 ліст.(№44).
20. Гомельская праўда.—1996.—21 дек.
21. Добры вечар.—1992.—20 ліп.
22. Зрок.—1991.--№6.
23. Культура.—1994.—15 чэрв.
24. Культура.—1992.—май(№20).
25. Літаратура і мастацтва.—1994.—14 студз.
26. Літаратура і мастацтва.—1993.—27 жн.
27. Маладосць.—1973.--№5.
28. Народная воля.—1998.--28 жн.
29. Народная воля.—1997.--26 жн.
30. Народнае слова.—1998.—9 чэрв.
31. Народнае слова.—1993.—20 студз.
32. Народнае слова.—1991.—28 вер.
33. Наша слова.—1993.—2 чэрв.(№28).
34. Першацвет.—1997.--№10.
35. Полацак.—1992.--№4.
36. Полацак.—1991.--№5.
37. Полымя.—1997.--№6.
38. Полымя.—1993.--№10.
39. Полымя.—1973.--№8.
40. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі.—1988.--№3.

41. Прамень.—1996.—май(№5).
42. Работніца і сялянка.—1991.--№11.
43. Рэспубліка.—1996.—23 студз.
44. Рэспубліка.—1992.—5 чэрв.
45. Спадчына.—1999.--№4.
46. Чырвоная змена.—1993.—10 сак.

47. Аргументы и факты.—1995.—май(№21).
48. Брестский курьер.—1998.—4-10 июня(№23).
49. Вечерний Минск.—1994.—18 авг.
50. Вечерний Минск.—1994.—24 авг.
51. Во славу Родины.—1996.--18 июля.
52. Во славу Родины.—1992.—7 марта.
53. Европейский перекресток.—1998.—6-20 июня.
54. Здравый смысл.—1996.—6 июн.(№23).
55. Лесная газета.—1993.—5 янв.
56. На рубеже столетий.—1998.--№2.
57. Новое время.—1989.--№26.
58. Оникс.—1998.--№2.
59. Сельская молодежь.—1996.--№1.
60. Советская Белоруссия.—1996.—19 июл.
61. Советская Белоруссия.—1990.—31 март.
62. Туризм и отдых.—1997.--№1,3,9,7.
63. Хозяин.—1991.--№6.

64. Nadson A. Come, Saint Euphrosyne, and stand up for is! // Belarus News.—1995.—juine(№1-7).
65. Iwaniuk J. Swieta Eufrozyna – ksiezna polocka // Czasopis.—1993.--№2.

## RESUME

**Theme:** Interpretation of Female Subjectivity in Writings about Yefrasinnya Polatskaya.

**Subject of research:** means for artistic interpretation of Yefrasinnya Polatskaya’s character in a literary text.

**Object of research:** texts of original culture about Yefrasinnya Polatskaya.

**Innovation of research:** cross-literary research of the canonized female character; an attempt of gynacritical analysis.

**Key words:** Belarusian literature, bibliographical reference list, female character, literary genres, literary character, structural analysis of a printed matter.

The article is devoted to the consideration of the first canonized female in Belarus – Yefrasinnya Polatskaya – in literature of various genres; it contains a bibliography reference list of scientific, religious, teaching, popular scientific literature and popular press on Yefrasinnya Polotskaya.

## АНАТАЦЫЯ

**Тэма:** Інтэрпрэтацыя жаночай суб’ектыунасці у творах пра Ефрасінню Полацкую.

**Прадмет даследавання:** сродкі мастацкай інтэрпрэтацыі вобраза Ефрасінні Полацкай у літаратурным тэксце.

**Аб’ект даследавання:** нацыянальныя культурныя тэксты пра Ефрасінню Полацкую.

**Навізна даследавання:** крос-літаратурнае даследаванне вобраза кананізаванай жанчыны; спроба гінакрытычнага аналізу.

**Ключавыя словы:** беларуская літаратура, бібліяграфічны даведнік, вобраз жанчыны, літаратурныя жанры, літаратурны персанаж, структурны аналіз выдання.

Матэрыял прысвечаны разгляду ролі вобраза першай кананізаванай жанчыны Беларусі Ефрасінні Полацкай у творах беларускай літаратуры розных жанраў; утрымлівае бібліяграфічны даведнік навуковай, рэлігійнай, метадычнай, навукова-папулярнай літаратуры і публіцыстыкі пра Ефрасінню Полацкую.